**ПРАТАКОЛ № 1**
паседжання журы абласнога адкрытага фестывалю гульні “Карнавал весялосці”

22 жніўня 2026 года г.п.Воранава

**ПРЫСУТНІЧАЛІ:**

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, *старшыня журы;* |
| Махалёва І.А. | дырэктар УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”, *намеснік старшыні журы*; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Мікуць Л.П. | выкладчык цыклавой камісіі “арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці” УА “Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў”. |

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Аб узнагароджанні пераможцаў абласнога адкрытага фестывалю гульні “Карнавал весялосці” (далей – фестываль) дыпломамі лаўрэатаў І, ІІ, ІІІ ступені ў рамках і прызамі, згодна п.13 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю.

2. Аб узнагароджанні асобных удзельнікаў фестывалю дыпломамі ў рамках і спецыяльнымі прызамі, згодна п. 14 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю.

3. Аб узнагароджанні астатніх удзельнікаў фестывалю дыпломамі за ўдзел.

**СЛУХАЛІ ПА ПЕРШАМУ ПЫТАННЮ:**

Мікуць Л.П., старшыню журы, аб узнагароджанні пераможцаў фестывалю дыпломамі лаўрэатаў І, ІІ, ІІІ ступені ў рамках і прызамі, згодна п.13 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю.

**Галасавалі за – 4; супраць – 0; устрымаліся – 0.**

**ПАСТАНАВІЛІ**:

На падставе галасавання членаў журы фестывалю ўзнагародзіць пераможцаў фестывалю дыпломамі лаўрэатаў І, ІІ, ІІІ ступені ў рамках і

прызамі, згодна п.13 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю.

**Лаўрэат I ступені**

- Народны тэатр гульні "Анфас" (кіраўнік – Сукач Людміла Вячаславаўна) Квасоўскі цэнтр культуры і развіцця народнай творчасці філіял ДУК "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр"– дыпломам лаўрэата I ступені ў рамцы і праектарам.

**Лаўрэат II ступені**

- Народны тэатр гульні "Свавольнікі" (кіраўнік – Панашчык Ганна Мікалаеўна) ДУК "Слонімскі раённы цэнтр культуры" – дыпломам лаўрэата II ступені ў рамцы і мікрахвалёвай печ'ю.

**Лаўрэат III ступені**

- Народны тэатр гульні "Завадатар" (кіраўнік – Крывянкова Вольга Канстанцінаўна) ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" – дыпломам лаўрэата III ступені ў рамцы і партатыўнай калонкай.

**СЛУХАЛІ ПА ДРУГОМУ ПЫТАННЮ:**

Куратчык С.В., намесніка начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, намесніка старшыні журы, аб узнагароджанні ўдзельнікаў фестывалю дыпломамі ў рамках і спецыяльнымі прызамі, згодна п.14 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю.

**Галасавалі за – 4; супраць – 0; устрымаліся – 0.**

**ПАСТАНАВІЛІ**:

На падставе галасавання членаў журы фестывалю ўзнагародзіць асобных удзельнікаў фестывалю дыпломамі ў рамках і спецыяльнымі прызамі, згодна п.14 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю.

**«За крэатыўнасць і наватарства вядзення праграмы»**

- Народны тэатр-студыя гульні "Ваўкавыскія забавы" (кіраўнік – Вярэцікава Аляксандра Аляксандраўна) ДУК "Ваўкавыскі раённы цэнтр культуры" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За прапаганду беларускай народнай гульні»**

- Народная студыя гульні "Воранаўскія пацехі" (кіраўнік – Юзвік Ганна Сяргееўна) ДУК "Воранаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За лепшае рэжысёрскае вырашэнне гульнёвай праграмы»**

- Народны тэатр гульні "100 друзей" (кіраўнік – Кузняцова Ірына Іванаўна) ДУ "Палац культуры горада Ліды" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За прадстаўленне праграмы, пабудаванай на рэгіянальным матэрыяле»**
- Вілінская Алена Мікалаеўна, філіял "Глядавіцкі цэнтр вольнага часу і культуры" ДУ "Мастоўскі раённы цэнтр культуры" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За лепшую аўтарскую праграму»**
- Народны тэатр гульні і забаў "Серпанцін" (кіраўнік – Чыркова Вольга Уладзіміраўна) ДУК "Ашмянскі раённы цэнтр культуры" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За лепшую праграму для моладзі»**
- Народны тэатр гульні "Бераг" (кіраўнік – Чайко Святлана Іванаўна) філіял "Мінойтаўскі культурна-дасугавы цэнтр" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«За цікавае ўвасабленне абрадавай дзеі ў гульнёвай праграме»**
- Народны тэатр-студыя гульні "Суседзі" (кіраўнік – Баклушына Людміла Іванаўна) ДУК "Дзятлаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**«Самы артыстычны аніматар»**
- Зайко Вікторыя Уладзіміраўна ўдзельніца народнага тэатра гульні "Ярэміцкія маскі" (кіраўнік – Кавалеўская Людміла Уладзіміраўна) філіял "Ярэміцкі Дом культуры" ДУ "Карэліцкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці" – дыпломам ў рамцы і прасам.

**СЛУХАЛІ ПА ТРЭЦЦЯМУ ПЫТАННЮ:**

Хільмончык К.В., аб узнагароджанні астатніх удзельнікаў фестывалю дыпломамі за ўдзел, згодна п. 14 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю.

**Галасавалі за – 4; супраць – 0; устрымаліся – 0.**

**ПАСТАНАВІЛІ:**

На падставе галасавання членаў журы фестывалю астатніх удзельнікаў фестывалю ўзнагародзіць дыпломамі за ўдзел, згодна п. 14 Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю.

С.В.Куратчык

І.А.Махалёва

К.В.Хільмончык

Л.П.Мікуць